Праваабарончы цэнтр «Вясна»

# Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі ў 2021 годзе

## Аналітычны агляд

spring96.org

**ВЫСНОВЫ**

*- выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія прайшлі ў жніўні 2020 года, і масавыя пратэсныя выступленні, якія адбыліся пасля іх, на працяглы тэрмін вызначылі палітычную сітуацыю ў Беларусі;*

*- гвалт, рэпрэсіі, знішчэнне грамадзянскай супольнасці, стварэнне атмасферы ўсеагульнага страху сталі інструментамі ўтрымання ўлады замест электаральнай падтрымкі;*

*- прававая сістэма прадэманстравала сваю няздольнасць абараніць правы чалавека і свабоды, поўную залежнасць ад дзейнай улады і актыўна ўключылася ў ажыццяўленне палітычных рэпрэсій у дачыненні да грамадзян;*

*- асноўнымі інструментамі ўтрымання ўлады і рэпрэсій у дачыненні да апанентаў, крытыкаў рэжыму і іншадумцаў сталі крымінальны і адміністрацыйны пераслед, адвольныя арышты, звальненне з працы і выцясненне з краіны;*

*- у Беларусі на 1 студзеня 2022 года налічваецца 969 палітвязняў, прызнаных такімі праваабарончымі арганізацыямі ў адпаведнасці з [Кіраўніцтвам па вызначэнні паняцця "палітычны зняволены"](). За год іх колькасць павялічылася на 800 чалавек. Пры гэтым больш за 100 чалавек, прызнаных палітвязнямі ў 2021 годзе, былі вызваленыя;*

*- ПЦ «Вясна» вядома пра не менш за 1 285 асуджаных па палітычна матываваных крымінальных справах за 2021 год;*

*- ПЦ «Вясна» вядома аб прынамсі 6 443 затрыманых і не менш чым 3 060 накладзеных адміністрацыйных спагнаннях за ажыццяўленне сваіх правоў і свабод, з якіх 2 186 – адміністрацыйныя арышты і 836 – адміністрацыйныя штрафы;*

*- за мінулы год уладамі не было праведзена належнага эфектыўнага расследавання гібелі ўдзельнікаў мірных сходаў А. Тарайкоўскага, Г. Шутава і Р. Бандарэнкі, смерці А. Віхора і В. Ашурка;*

*- таксама ўладамі не праведзена належнага расследавання каля пяці тысяч зваротаў (у тым ліку больш за 100 ад непаўналетніх) аб расследаванні і прыцягненні да адказнасці вінаватых у катаваннях і іншых актах забароненага абыходжання ў дачыненні да ўдзельнікаў мірных акцый пратэсту і іншых асоб, якія паступілі ў следчыя органы, у тым ліку 680 заяў аб катаваннях у ізалятарах г. Мінска непасрэдна пасля выбараў у жніўні 2020 года, калі тысячы затрыманых удзельнікаў пратэстаў у Мінску і іншых гарадах краіны былі мэтанакіравана падвергнутыя катаванням і іншым відам жорсткага, бесчалавечнага і зневажальнага абыходжання. На дадзены момант ПЦ «Вясна» задакументавана больш за 1 000 сведчанняў ахвяр катаванняў. Іх аналіз дазваляе сцвярджаць, што катаванні насілі масавы, сістэмны характар і з'яўляліся арганізаванай, палітычна матываванай карнай акцыяй уладаў па застрашванні беларускага грамадства;*

*- улады працягваюць актыўна прымяняць рэпрэсіі ў дачыненні да журналістаў у сувязі з іх прафесійнай дзейнасцю: паводле звестак БАЖ, 32 журналісты і супрацоўнікі СМІ на*

*дадзены момант пазбаўленыя волі, 113 журналістаў былі затрыманыя, 29 разоў яны адбывалі адміністрацыйны арышт, за год праведзена 146 перетрусаў;*

*- практычна ўсе сябры ПЦ «Вясна» на працягу года падвяргаліся рэпрэсіям у розных формах, у тым ліку затрыманням і адміністрацыйным арыштам. У СІЗА па розных надуманых абвінавачваннях утрымліваюцца каардынатарка валанцёрскай службы ПЦ «Вясна» Марыя (Марфа) Рабкова, старшыня «Вясны» Алесь Бяляцкі, сябра Рады арганізацыі Валянцін Стэфановіч, юрыст і каардынатар кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» Уладзімір Лабковіч і валанцёр арганізацыі Андрэй Чапюк; кіраўнік гомельскай філіі «Вясны» Леанід Судаленка і валанцёрка Таццяна Ласіца асуджаныя адпаведна да трох і двух з паловай гадоў пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі; у праваабаронцаў праведзена не менш за 86 перетрусаў, яны падвергліся не менш за 146 допытам;*

*- судовая сістэма ўключылася ў працэс рэпрэсій, ігнаруючы стандарты справядлівага суда; адвакатура страціла рысы незалежнага самакіравальнага інстытута; адвакаты ажыццяўляюць сваю дзейнасць ва ўмовах сталага ціску, пагроз і пераследу;*

*- Рэспубліка Беларусь працягвае прымяняць смяротнае пакаранне. На працягу года быў вынесены смяротны прысуд у дачыненні да аднаго чалавека; у СІЗА ў чаканні выканання смяротных прысудаў утрымліваліся ад трох да пяці чалавек, як мінімум адзін з якіх сёлета, магчыма, быў пакараны, а двое – памілаваны;*

*- палітычныя рэпрэсіі 2021 г. з'яўляюцца па шэрагу паказчыкаў самымі масавымі ў найноўшай гісторыі Беларусі і сведчаць аб глыбокім крызісе з правамі чалавека ў краіне, які прывёў да міжнароднай ізаляцыі Беларусі і санкцый з боку краін ЕС, ЗША і Вялікабрытаніі. Адзіным адказам уладаў на патрабаванні палітычных пераўтварэнняў у краіне з боку большасці беларускага грамадства з'яўляецца ўзмацненне рэпрэсій і імітацыя агульнанацыянальнага дыялогу па г.зв. канстытуцыйнай рэформе. Дадзеная палітыка ўладаў толькі ўзмацняе крызіс і стварае перадумовы для яго далейшага развіцця ў будучыні.*

## I. УСТУП

У 2021 годзе грамадска-палітычны кантэкст вызначаўся наступствамі сітуацыі, якая склалася ў Беларусі пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года. Дзейнасць большай часткі інстытутаў улады была засяроджана на вяртанні кантролю над грамадствам, якое ў сваёй пераважнай большасці адмовіла ў электаральнай падтрымцы Аляксандру Лукашэнку, і пераадоленні эканамічных наступстваў неабдуманых палітычных крокаў і рашэнняў. Нягледзячы на абвяшчэнне ўладамі 2021-га Годам народнага адзінства, канфлікт паміж прыхільнікамі палітычных і грамадскіх перамен і абаронцамі стагнуючага рэакцыйнага рэжыму няўхільна паглыбляецца і нарастае. Правядзенне фармальных мерапрыемстваў з удзелам дзяржаўных органаў і праўладных арганізацый не замяніла ўстанаўлення рэальнага нацыянальнага дыялогу з удзелам усіх зацікаўленых бакоў, неад'емнай умовай якога павінны былі стаць вызваленне ўсіх палітычных зняволеных, адмена і перагляд іх прысудаў, шырокая палітычная амністыя ў дачыненні да іншых фігурантаў палітычна матываваных справаў, а таксама расследаванне злачынстваў супраць чалавечнасці, учыненых у жніўні 2020 года і наступныя месяцы, і прыцягненне вінаватых да адказнасці.

Інструментамі рэпрэсій у дачыненні да апанентаў і крытыкаў рэжыму, удзельнікаў мірных сходаў і іншых пратэсных акцый, а таксама грамадзян, якія праявілі палітычную нелаяльнасць да А. Лукашэнкі, які па-ранейшаму ўтрымлівае ўладу, сталі крымінальны і адміністрацыйны пераслед, адвольныя напады на грамадзян і іх жыллё пад маркай правядзення следчых дзеянняў па надуманых абвінавачваннях, катаванні і негуманнае абыходжанне з затрыманымі і арыштаванымі. Па спісах, сфарміраваных спецслужбамі па выніках аналізу падпісных лістоў у падтрымку незалежных кандыдатаў на выбарах прэзідэнта, дадзеных аб удзеле ў пратэсных акцыях і іншых звестках аб дзейнасці і перакананнях грамадзян, адбываліся іх масавыя незаконныя звальненні з працы і службы.

Правядзенне несумленных выбараў і масавыя парушэнні правоў чалавека прывялі рэжым Лукашэнкі да міжнароднай ізаляцыі з боку краін Захаду: краіны-ўдзельніцы ЕС, Вялікабрытанія, ЗША, Канада і шэраг іншых краін заявілі аб непрызнанні Лукашэнкі легітымна абраным прэзідэнтам краіны. Шырокамаштабныя парушэнні правоў чалавека, рэпрэсіі ў дачыненні да апанентаў рэжыму, а таксама пасадка ў Беларусі самалёта кампаніі Ryanair і інспіраваны ўладамі Беларусі міграцыйны крызіс на ўсходніх межах Еўрасаюза прывялі да ўвядзення ЕС, Вялікабрытаніяй, Швейцарыяй, Нарвегіяй, ЗША, Канадай і шэрагам іншых краін санкцый у дачыненні да беларускіх прадпрыемстваў і асоб, якія маюць дачыненне да рэпрэсій і фінансуюць рэжым.

З іншага боку, рэжым атрымаў палітычную падтрымку ўладаў Расійскай Федэрацыі, якая аддаляе магчымасці канстытуцыйных дэмакратычных зменаў улады ў Беларусі; змены на гэтым фоне вектара эканамічнай палітыкі часткова саслабляюць уплыў эканамічных санкцый. Цаной такой падтрымкі становіцца ўпэўнены дрэйф у бок страты рэальнага суверэнітэту Беларусі ў знешнепалітычнай, эканамічнай, ваеннай сферах.

24 сакавіка Савет па правах чалавека ААН ухваліў рэзалюцыю, у якой асуджаюцца дзеянні ўладаў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх. У дакуменце выказваецца “глыбокая заклапочанасць” сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі і асуджаюцца “грубыя парушэнні правоў чалавека, адвольныя затрыманні і арышты апазіцыянераў, журналістаў, праваабаронцаў і звычайных грамадзян”.

У гэты ж дзень пачала працу Міжнародная платформа для Беларусі па прыцягненні вінаватых да адказнасці (International Accountability Platform for Belarus) — кааліцыя незалежных праваабарончых арганізацый, якія аб’ядналі свае намаганні для збору, апрацоўкі, праверкі і захавання доказаў сур’ёзных парушэнняў правоў чалавека, у тым ліку катаванняў, учыненых беларускімі ўладамі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і ў наступны перыяд.

24 верасня на 48-й сесіі Савета па правах чалавека ААН адбыўся інтэрактыўны дыялог па прамежкавай вуснай абноўленай інфармацыі УВКПЧ аб сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх. Вярхоўны камісар Мішэль Бачэлет пачала сустрэчу з заявы, у якой падкрэсліла, што сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі ў 2021 годзе працягвае пагаршацца.

35 дзяржаў-сябраў АБСЕ ініцыявалі запуск Венскага механізму ў сувязі з сур’ёзнымі парушэннямі правоў чалавека ў Беларусі. Нагодай для гэтага сталі пагаршэнне сітуацыі, невыкананне беларускімі ўладамі рэкамендацый справаздачы ў межах Маскоўскага

механізму і прапановаў АБСЕ для вырашэння крызісу. Адпаведны ліст быў накіраваны пастаяннаму прадстаўніку Беларусі пры АБСЕ.

Між тым напрыканцы года набыла больш пэўныя абрысы рыторыка ўладаў па пытанні канстытуцыйнай рэформы: апублікаваны праект Канстытуцыі са зменамі і дапаўненнямі прадугледжвае фактычную адмову ад прынцыпу падзелу ўладаў, надзяленне важнымі функцыямі органа, які мае ствараецца на непразрыстай, недэмакратычнай аснове — Усебеларускага сходу, імунітэт ад крымінальнага пераследу для А. Лукашэнкі, іншыя сумнеўныя з пункту гледжання правоў чалавека новыя палажэнні.

## II. ПАЛІТЫЧНА МАТЫВАВАНЫ КРЫМІНАЛЬНЫ ПЕРАСЛЕД І ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

На працягу 2021 г. крымінальны пераслед грамадзян заставаўся асноўным відам рэпрэсій, якія прымяняліся ўладамі Беларусі. ПЦ «Вясна» вядомы звесткі аб 1 285 асуджаных па такіх справах на працягу года, а ўсяго — аб 1 380 асуджаных у сувязі з пратэснай актыўнасцю. 30 верасня першы намеснік старшыні Следчага камітэта А. Шандаровіч паведаміў, што з 9 жніўня 2020 года зарэгістравана больш за 5 000 "злачынстваў, звязаных з пратэснымі акцыямі". З іх каля 3,3 тыс. за першыя дзевяць месяцаў 2021 г. Справы, звязаныя з "экстрэмісцкай, пратэснай актыўнасцю", склалі тады 5,5% ад агульнага масіву крымінальных спраў, "з рэальным ужываннем гвалту здзейснена менш за 3% злачынстваў гэтай катэгорыі".

Найбольш масавымі былі крымінальныя справы ў дачыненні да ўдзельнікаў вулічных акцый пратэсту. Усяго, па дадзеных ПЦ «Вясна», пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года не менш за 421 чалавека былі асуджаныя па арт. 342 КК за арганізацыю і падрыхтоўку дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх; 182 — за арганізацыю, фінансаванне масавых беспарадкаў, удзел у іх і падрыхтоўку асоб да ўдзелу ў іх; больш за 500 — за дыфамацыйныя злачынствы ў дачыненні да А. Лукашэнкі, прадстаўнікоў улады, суддзяў і чыноўнікаў. У дачыненні да 37 чалавек вядомыя прысуды па арт. 130 КК за распальванне сацыяльнай варожасці (у дачыненні да прадстаўнікоў улады), у дачыненні да 65 — па арт. 370 КК за знявагу дзяржаўных сімвалаў. Каля 220 абвінавачанняў датычыліся гвалту або пагрозы яго прымянення ў дачыненні да прадстаўнікоў улады.

ПЦ «Вясна» вядома пра 580 асуджаных да пазбаўлення волі ў калоніі ці турме (з іх непаўналетніх — 11), 370 — да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову, 369 — да абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову, 34 — да арышту. Такім чынам, пакаранне больш за 71% асуджаных было звязана з пазбаўленнем асабістай волі.

У канцы снежня стала вядома аб першых крымінальных справах па арт. 342-2 КК за неаднаразовае парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў.

На працягу года вялося следства і разглядаліся палітычна матываваныя крымінальныя справы па абвінавачанні ў здрадзе дзяржаве, змове або іншых дзеяннях, учыненых з мэтай захопу дзяржаўнай улады, закліках да дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь, стварэнні экстрэмісцкага фарміравання, акце тэрарызму. Фігурантам гэтых спраў прызначаны дэманстратыўна жорсткія пакаранні.

У траўні за здраду дзяржаве быў асуджаны да васямнаццаці гадоў пазбаўлення волі капітан Дзяніс Урад за перадачу СМІ інфармацыі аб удзеле вайскоўцаў Міністэрства абароны ў падаўленні пратэстаў.

6 верасня ў Мінску асуджаныя сябры прэзідыума Каардынацыйнай рады: Максім Знак да дзесяці, Марыя Калеснікава — да адзінаццаці гадоў пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі. Абое былі абвінавачаныя ў змове з мэтай захопу дзяржаўнай улады, публічных закліках да захопу дзяржаўнай улады, стварэнні экстрэмісцкага фармавання.

14 снежня ў Гомелі быў абвешчаны прысуд шасці палітвязням: Сяргею Ціханоўскаму, Ігару Лосіку, Мікалаю Статкевічу, Уладзіміру Цыгановічу, Арцёму Сакаву і Дзмітрыю Папову. Паводле прысуду прызначаны пакаранні ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін: Сяргею Ціханоўскаму — 18 гадоў, Мікалаю Статкевічу — 14 гадоў, Ігару Лосіку — 15 гадоў, Дзмітрыю Папову — 16, Арцёму Сакаву — 16 гадоў, Уладзіміру Цыгановічу — 15 гадоў за арганізацыю “масавых беспарадкаў” у Беларусі падчас падрыхтоўкі і правядзення прэзідэнцкіх выбараў у 2020 годзе, распальванне сацыяльнай варожасці і перашкоду працы Цэнтрвыбаркама.

17 снежня ў Мінскім гарадскім судзе вынесены прысуд палітвязню Эдуарду Пальчысу. За арганізацыю масавых беспарадкаў, дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, распальванне сацыяльнай варожасці, заклікі да дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь, блогер прысуджаны да пазбаўлення волі тэрмінам на 13 гадоў.

22 снежня ў Мінскім абласным судзе анархісты Дзмітрый Дубоўскі, Дзмітрый Рэзановіч, Ігар Аліневіч і Сяргей Раманаў за падпал службовых аўтамабіляў, будынкаў ДАІ і дзяржаўнага камітэта экспертыз у Гомельскай вобласці прысуджаны да пазбаўлення волі: Ігар Аліневіч і Сяргей Раманаў тэрмінам на 20 гадоў, Дзмітрый Дубоўскі — на 18 гадоў, Дзмітрый Рэзановіч — на 19 гадоў.

27 снежня ў Мінскім гарадскім судзе абвясцілі прысуд па крымінальнай справе ў дачыненні да Ягора Дуднікава: 11 гадоў калоніі за распальванне варожасці і заклікі да дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Беларусі.

За 2021 год у Пералік арганізацый і фізічных асоб, якія маюць дачыненне да тэрарыстычнай дзейнасці, унесеныя 42 абвінавачаныя ва ўчыненні тэракту і ў замаху на здзяйсненне тэракту. Унясенне ў гэты пералік шэрагу палітыкаў і грамадскіх дзеячаў сведчыць аб палітычна матываваным характары прыняцця адпаведных рашэнняў.

Увесну 2021 года ў заканадаўства Беларусі ўнесены змены, якія датычыліся пашырэння і ўзмацнення жорсткасці адказнасці за рознага кшталту пратэсную актыўнасць. У тым ліку знайшлі сваё заканадаўчае замацаванне многія з сумнеўных з пункту гледжання права падыходаў, якія выкарыстоўваліся ўладай у папярэдні перыяд барацьбы з пратэстоўцамі і іншадумцамі. У прыватнасці, зменены законы аб супрацьдзеянні экстрэмізму, аб СМІ і масавых мерапрыемствах, аб ваенным і надзвычайным становішчы, Крымінальны кодэкс і інш.; прыняты закон аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму.

Працягваецца крымінальны праслед сябраў Каардынацыйнай рады: у 2021 годзе СК паведаміў аб новых высунутых абвінавачваннях прадстаўнікам Каардынацыйнай рады Святлане Ціханоўскай і Паўлу Латушку.

Асобна трэба адзначыць крымінальны пераслед журналістаў у сувязі з ажыццяўленнем імі сваіх прафесійных абавязкаў. Паводле звестак БАЖ, 32 журналісты і супрацоўнікі СМІ пазбаўлены волі па розных надуманых абвінавачаннях.

Працягваліся рэпрэсіі ў адносінах да праваабаронцаў. На працягу года офісы праваабарончых арганізацый і жыллё праваабаронцаў неаднаразова падвяргаліся ператрусам з канфіскацыяй камп'ютарнай тэхнікі і іншых носьбітаў інфармацыі, грошай і друкаванай прадукцыі.

У прыватнасці, практычна ўсе сябры ПЦ «Вясна» і многія валанцёры сутыкнуліся з пераследам за праваабарончую дзейнасць: за год у іх было праведзена не менш за 86 ператрусаў, не менш за 146 разоў праваабаронцы «Вясны» падвергліся допытам.

У СІЗА па розных надуманых абвінавачваннях утрымліваюцца каардынатарка валанцёрскай службы ПЦ «Вясна» Марыя (Марфа) Рабкова, старшыня «Вясны» Алесь Бяляцкі, сябра Рады арганізацыі Валянцін Стэфановіч, юрыст і каардынатар кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» Уладзімір Лабковіч і валанцёр арганізацыі Андрэй Чапюк. Кіраўнік гомельскага аддзялення «Вясны» Леанід Судаленка і валанцёрка Таццяна Ласіца асуджаныя ў закрытым пасяджэнні адпаведна да трох і двух з паловай гадоў пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі.

Яшчэ некалькі сяброў ПЦ «Вясна» з'яўляюцца падазраванымі па справе і затрымліваліся тэрмінам да трох сутак.

Падчас масавага нападу на праваабаронцаў і журналістаў 16 лютага ў дом Змітра Салаўёва пад Мінскам уварваліся супрацоўнікі АМАПа і ГУБАЗіка і правялі ператрус, канфіскавалі тэхніку. Ператрус адбываўся ў межах крымінальнай справы па арт. 342 КК. Пасля ператрусу праваабаронцу затрымалі. Пры затрыманні і ў мікрааўтобусе па дарозе ў ІЧУ яго збівалі.

Кіраўнік «Офіса па правах людзей з інваліднасцю» Сяргей Драздоўскі і юрыст арганізацыі Алег Граблеўскі ўтрымліваліся адпаведна пад хатнім арыштам і ў СІЗА больш за тры месяцы па абвінавачанні ў махлярстве: прэтэнзіі ўладаў датычылі аплаты супрацоўнікамі Офіса паслугаў адвакатаў для грамадзян, якія трапілі пад пераслед пасля пратэстаў. Пасля змены меры стрымання яны былі змушаныя пакінуць Беларусь пад пагрозай адвольнага пазбаўлення волі.

Такім чынам, 2021-ы стаў годам самых масавых рэпрэсій па шэрагу паказчыкаў за ўсю найноўшую гісторыю Беларусі. У прыватнасці, працяг палітычна матываванага крымінальнага пераследу прывёў да з'яўлення на працягу года 800 новых палітвязняў, прызнаных такімі праваабарончымі арганізацыямі ў адпаведнасці з Кіраўніцтвам па вызначэнні паняцця "палітычны зняволены". За год іх колькасць павялічылася да 969 чалавек, прычым больш за 100 чалавек, прызнаных палітвязнямі ў 2021 годзе, былі вызваленыя.

Паводле звестак Валанцёрскай службы ПЦ «Вясна», за 2021 год па палітычных матывах затрыманні зазналі не менш за 6 443 чалавекі, траціна з якіх жанчыны, а 19 — непаўналетнія; больш за 70% затрыманняў прыпала на Мінск, 10 — на Брэст і вобласць, больш за 4% — на Мінскую вобласць, менш за 4% — на Віцебск і вобласць, па 3% — на

астатнія вобласці. Судамі разгледжана не менш як 3 211 адміністрацыйных спраў, па якіх накладзена больш за 830 штрафаў і 2 170 адміністрацыйных арыштаў.

## III. ПРАВА НА ЖЫЦЦЁ. ПРАБЛЕМА СМЯРОТНАГА ПАКАРАННЯ

У ходзе падаўлення спецпадраздзяленнямі мірных акцый пратэсту супраць фальсіфікацыі выбараў у жніўні 2020 года ад рук супрацоўнікаў МУС і Міністэрства абароны загінулі не менш за два пратэстоўцы — Аляксандр Тарайкоўскі ў Мінску і Генадзь Шутаў у Брэсце. Непасрэдна пасля затрымання, пры адсутнасці своечасовай медыцынскай дапамогі, памёр Аляксандр Віхор з Гомеля. 11 лістапада 2020 года ў Мінску невядомымі быў збіты і затрыманы Раман Бандарэнка; у ноч на 12 лістапада ён быў дастаўлены ў шпіталь з Цэнтральнага РУУС г. Мінска з цяжкімі траўмамі, ад якіх неўзабаве памёр. Улады не зрабілі эфектыўных захадаў па расследаванні ўсіх гэтых выпадкаў, і вінаватыя ў гібелі людзей не былі прыцягнуты да адказнасці.

21 траўня ў Папраўчай калоніі №17 г. Шклова памёр палітвязень Вітольд Ашурак. З распаўсюджаных СК відэазапісаў і звестак вынікае, што гібелі палітвязня ў штрафным ізалятары папярэднічала атрыманне ім траўм галавы, пасля чаго ён не атрымаў неабходнай медыцынскай дапамогі. Належнага расследавання не было зроблена і ў гэтым выпадку.

У ноч на 26 траўня ў Мінску 18-гадовы Дзмітрый Стахоўскі, фігурант крымінальнай справы аб “масавых беспарадках” 9-11 жніўня 2020 года, скончыў жыццё самагубствам, скокнуўшы з 16-павярховага будынка. Хлопец перад гэтым пакінуў перадсмяротны пост «ВКонтакте», у якім тлумачыць свой учынак крымінальным праследам з-за ўдзелу ў мітынгах і маральным ціскам Следчага камітэта. У той жа дзень СК заявіў аб адсутнасці парушэнняў пры расследаванні крымінальнай справы, не чакаючы заканчэння адпаведнай праверкі.

У Мінску адна з “адпрацовак” кватэр сілавікамі, калі ў жыллё грамадзян, якія падазраюцца ў датычнасці да пратэснай актыўнасці, урываюцца супрацоўнікі МУС і КДБ пры падтрымцы спецпадраздзяленняў, праводзяць ператрусы і адабранне тэхнікі і грошай, часта затрымліваюць ці збіваюць гаспадароў, скончылася трагічна: Андрэй Зельцэр, гаспадар кватэры, куды, узламаўшы дзверы, уварваліся сілавікі ў цывільным, сустрэў іх стральбой з зарэгістраванай паляўнічай зброі, смяротна параніў аднаго з нападнікаў і быў забіты агнём у адказ. Жонка Зельцэра Марыя Успенская была адвольна затрыманая па падазрэнні ў саўдзеле ў забойстве.

КДБ Беларусі паспяшаўся назваць загінулага А. Зельцэра асабліва небяспечным злачынцам, а Генеральная пракуратура на наступную раніцу паведаміла вынікі праверкі, праведзенай па факце прымянення зброі супрацоўнікамі КДБ. Следчым камітэтам узбуджана крымінальная справа па факце забойства супрацоўніка КДБ. Афіцыйная рыторыка аб адпрацоўцы “адрасоў, па якіх маглі знаходзіцца асобы, якія маюць дачыненне да тэрарызму,” змянілася сцвярджэннем аб наяўнасці ў групы сілавікоў правамернай мэты — правядзенні ператрусу, санкцыянаванага пракурорам, пры якім дапускаецца ўскрыццё памяшканняў.

Грамадзян, якія публічна ўхвалілі ўчынак А. Зельцэра і крытыкавалі паводзіны сілавікоў, абвінавацілі ў распальванні нянавісці і ўзялі пад варту. Па няпоўных дадзеных, гэта магло закрануць больш за сто чалавек.

Пасля адміністрацыйнага арышту ў ізалятары ў Мінску ад наступстваў каранавіруснай інфекцыі памерла Алена Амеліна. Яе затрымлівалі па адміністрацыйных артыкулах у красавіку і верасні 2021 года. Журналістка «Нашай Нівы» Кацярына Карпіцкая, якая была з Аленай у адной камеры, паведаміла, што яшчэ ў камеры "Алене за адзін дзень стала вельмі дрэнна, яна амаль трупам ляжала пад нарамі, мы прымушалі яе хоць нешта з'есці. Лячылася ўсё гэта парацэтамолам і, калі зусім чалавеку дрэнна, антыбіётыкам. З ЦІП Алена адправілася на ШВЛ, і так і не выкараскалася".

У Беларусі да гэтага часу захоўваецца пакаранне смерцю. У 2021 годзе паўторна вынесены і ўступіў у сілу смяротны прысуд Віктару Скрундзіку. Раней па апеляцыйнай скарзе абвінавачанага і яго абаронцы прысуд быў адменены Вярхоўным Судом і справа разглядалася нанава. У цяперашні час ён утрымліваецца ў СІЗА-1 у камеры смяротнікаў і чакае выканання прысуду. Таксама ў 2021 годзе там жа ўтрымліваліся Віктар Паўлаў і Віктар Сергель. Ёсць падставы лічыць, што прысуд у дачыненні да Паўлава ці абодвух асуджаных ужо выкананы.

У красавіку смяротны прысуд Іллю і Станіславу Косцевым у парадку памілавання быў заменены на пажыццёвае зняволенне. Гэта другі вядомы праваабаронцам выпадак памілавання асуджаных да смяротнага пакарання за гісторыю незалежнай Беларусі.

7 верасня Камітэт па правах чалавека ААН апублікаваў сваё рашэнне па справе Аляксея Міхалені, расстралянага ў траўні 2018 г. Камітэт прыйшоў да высновы, што права Міхалені на жыццё было парушана паводле артыкула 6 Пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, паколькі ён быў прысуджаны да смяротнага пакарання у выніку несправядлівага суда. Аўтарам звароту, які быў накіраваны ў Камітэт у студзені 2018 г., з'яўляецца бацька Міхалені; дакумент падрыхтаваў каардынатар кампаніі «Праваабаронцы супраць смяротнага пакарання ў Беларусі» Андрэй Палуда. На момант падачы скаргі Міхаленя знаходзіўся ў камеры смяротнікаў у чаканні расстрэлу, які ў выніку быў прыведзены ў выкананне, нягледзячы на просьбу прыпыніць прывядзенне яго ў выкананне, пакуль не будзе разгледжаны зварот. Гэта не першае такое рашэнне КПЧ.

## IV. АБМЕЖАВАННІ СВАБОДЫ МІРНЫХ СХОДАЎ

За мінулы год апазіцыяй і прыхільнікамі перамен у Беларусі не было праведзена ніводнага дазволенага ўладамі масавага мерапрыемства. Усе спробы правесці спантанныя мерапрыемствы былі жорстка задушаны. Шматлікія затрыманні адбыліся ў сакавіку ў сувязі з Днём Волі і 26 красавіка, у дзень правядзення традыцыйнага «Чарнобыльскага шляху».

Дзеючае ў Беларусі заканадаўства і практыка яго прымянення, як і раней, парушае і адвольна абмяжоўвае свабоду мірных сходаў і свабоду выказвання меркавання. У законе адсутнічае правіла аб прэзумпцыі на карысць ажыццяўлення права на мірныя сходы; працэс атрымання дазволу на правядзенне масавых мерапрыемстваў, у тым ліку на адзіночны пікет, па-ранейшаму спалучаны з празмернымі патрабаваннямі і абмежаваннямі, а таксама са значнымі выдаткамі. Паведамляльны парадак правядзення некаторых відаў мірных сходаў быў адменены ўнесенымі ў закон аб масавых мерапрыемствах зменамі.

Да ранейшых заканадаўчых забаронаў дадалася забарона на збор, атрыманне і выкарыстанне грашовых сродкаў, іншай маёмасці і правоў, а таксама выкананне работ,

аказанне паслуг для мэтаў кампенсацыі расходаў, абумоўленых прыцягненнем асобы да адказнасці за парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў, а таксама забарона асвятлення “ў сродках масавай інфармацыі, глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт або іншых інфармацыйных сетках у рэжыме рэальнага часу (у прамым эфіры) масавых мерапрыемстваў, якія праводзяцца з парушэннем устаноўленага парадку іх арганізацыі або правядзення, у мэтах іх папулярызацыі або прапаганды”.

У Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях унесены змяненні, якія істотна ўзмацнілі жорсткасць пакарання за парушэнне парадку арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў: максімальны штраф вырас утрая і склаў 200 базавых велічынь (каля 2 000 еўра), а за паўторнае парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў новы кодэкс вызначае спецыяльную працягласць арышту — на тэрмін ад пятнаццаці да трыццаці сутак.

Па змененым законе аб супрацьдзеянні экстрэмізму публічныя заклікі да арганізацыі або правядзення “незаконных сходу, мітынгу, вулічнага шэсця, дэманстрацыі або пікетавання з парушэннем устаноўленага парадку іх арганізацыі або правядзення” могуць быць адвольна аднесены да экстрэмізму.

Некаторыя ўдзельнікі масавых мерапрыемстваў падвяргаюцца працяглым тэрмінам арыштаў (два, тры і больш месяцаў). Суды, выкарыстоўваючы недахопы заканадаўства, прызначаюць ім паслядоўна некалькі спагнанняў.

Пераслед удзельнікаў мірных сходаў не абмяжоўваецца адміністрацыйным. Многія з іх былі звольненыя з працы ці адлічаны з навучальных устаноў.

## V. ПАРУШЭННІ СВАБОДЫ ВЫКАЗВАННЯ МЕРКАВАННЯЎ

Любыя формы выказвання меркаванняў, альтэрнатыўных афіцыйным, жорстка адвольна абмяжоўваюцца і спыняюцца ўладамі. Па-ранейшаму заканадаўства аб масавых мерапрыемствах распаўсюджваецца на такія формы выказвання меркавання, як выкарыстанне сцягоў і сімвалаў, у тым ліку на прыватных тэрыторыях і ў памяшканнях: адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе буйных штрафаў і арышту падвяргаліся тыя грамадзяне, якія выкарыстоўваюць нацыянальныя бел-чырвона-белыя спалучэнні колераў, якія сталі сімвалам пратэсту.

Заканадаўства аб барацьбе з экстрэмізмам таксама адвольна выкарыстоўваецца для абмежавання свабоды выказвання меркаванняў: суда тыражуюць рашэнні аб прызнанні экстрэмісцкімі матэрыяламі інфармацыйнай прадукцыі, размешчанай на розных інтэрнэт-рэсурсах. За 2021 год пад забарону трапілі вядучыя інфармацыйныя сайты, у т.л. tut.by, belsat.eu, belaruspartisan.by, а таксама больш за 450 старонак у сацыяльных сетках і тэлеграм-каналаў грамадска-палітычнага характару. Спасылка на любы матэрыял з рэсурсу, прызнанага экстрэмісцкім, прыводзіць да адміністрацыйнай адказнасці. За 2021 год судамі за гэта было накладзена не менш як 43 адміністрацыйныя штрафы і не менш як 104 разоў прыменены адміністрацыйны арышт.

Паказальнай стала гісторыя мужа і жонкі Сяргея Крупеніча і Анастасіі Крупеніч-Кандрацьевай, якія былі затрыманыя ў сярэдзіне ліпеня і дзевяць разоў запар былі падвергнутыя адміністрацыйнаму арышту за перасланыя адно аднаму ў асабістых

паведамленнях навіны з тэлеграм-каналаў, якія ўлады прызналі экстрэмісцкімі. Такім чынам, паводле адміністрацыйных артыкулаў яны правялі ў зняволенні больш за тры месяцы – 126 і 127 сутак, адпаведна.

22 снежня СК завяршыў расследаванне крымінальнай справы ў дачыненні да мастака Алеся Пушкіна. Устаноўлена, што Алесь Пушкін "выконваў і размяшчаў у адкрытым доступе партрэты саўдзельнікаў нацысцкіх злачынцаў у вобразе беларускіх патрыётаў і гераічных асоб. Ім былі намаляваны Міхал Вітушка — галоўны арганізатар мабільных атрадаў акупацыйнай дапаможнай паліцыі, якая дзейнічала ў тылавым раёне нямецкай групы армій «Цэнтр» на тэрыторыі акупаванай Беларусі, сфарміраваных з ліку беларускіх нацыяналістаў, і Усевалада Родзькі — бурмістра Віцебска, які супрацоўнічаў з фашыстамі і быў завербаваны абверам". Акрамя таго, Пушкін "падчас выставы ў Гродне публічна дэманстраваў партрэт Яўгена Жыхара, які з 1946 года ўзначаліў атрад з былых паліцаяў… Абвінавачаны назваў памагатага нацыстаў беларускім патрыётам і яркім прадстаўніком антысавецкага супраціву".

Алесю Пушкіну прад'яўлена абвінавачанне па ч. 3 арт. 130 (наўмысныя дзеянні па рэабілітацыі нацызму, учыненыя групай асоб) і арт. 370 (здзек з дзяржаўных сімвалаў) КК.

## VI. АБМЕЖАВАННІ СВАБОДЫ РАСПАЎСЮДЖАННЯ ІНФАРМАЦЫІ, ПЕРАСЛЕД ЖУРНАЛІСТАЎ

На працягу года некалькі дзясяткаў журналістаў, блогераў і супрацоўнікаў медыяў зазналі затрыманні, ператрусы, адміністрацыйны і крымінальны пераслед.

У адносінах да службовых асоб аднаго з найбуйнейшых незалежных медыяў Беларусі, партала TUT.BY, узбуджана справа па артыкуле аб ухіленні ад сплаты падаткаў. Сайт рэсурса заблакаваны рашэннем Міністэрства інфармацыі краіны. Трынаццаць журналістаў і іншых супрацоўнікаў рэдакцыі затрыманыя 18 траўня і да гэтага часу знаходзяцца пад вартай і хатнім арыштам; у іх ліку — Марына Золатава, Вольга Лойка, Людміла Чэкіна, Алена Талкачова.

8 ліпеня па падазрэнні ў злачынстве затрыманы і пасля ўзяты пад варту галоўны рэдактар «Нашай Нівы» Ягор Марціновіч і начальнік аддзела рэкламы і маркетынгу Андрэй Скурко.

18 жніўня прайшлі ператрусы ў навінавым агенцтве БелаПАН; арыштаваныя і змешчаныя ў СІЗА дырэктарка і галоўная рэдактарка Ірына Леўшына і былы дырэктар Дзмітрый Наважылаў.

Гэтыя і іншыя журналісты і супрацоўнікі медыяў прызнаныя палітвязнямі; іх арышты накіраваныя на ліквідацыю незалежнай журналістыкі і звужэнне інфармацыйнай прасторы ў Беларусі.

Акрамя таго, шэраг вядомых блогераў былі асуджаныя за ажыццяўленне свабоды слова да розных тэрмінаў пазбаўлення волі.

Так, Сяргею Пятрухіну і Аляксандру Кабанаву ў судзе Кастрычніцкага раёна Магілёва 14 красавіка па абвінавачанні ў арганізацыі і падрыхтоўцы дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, у абразе прадстаўніка ўлады і суддзі прызначана па тры гады

пазбаўлення волі. Па падобным абвінавачанні на той жа тэрмін быў асуджаны 2 лютага Уладзімір Няронскі.

У снежні Арцём Сакаў, аператар YouTube-канала С. Ціханоўскага «Краіна для жыцця», і мадэратар сацсетак яго праекта Дзмітрый Папоў прысуджаныя да 16 гадоў пазбаўлення волі, аўтару YouTube-канала MozgON Уладзіміру Цыгановічу і Telegram-канала «Беларусь галаўнога мозга» Ігару Лосіку прызначылі па 15 гадоў пазбаўлення волі па надуманых абвінавачаннях.

Блогер Эдуард Пальчыс асуджаны да 13 гадоў калоніі.

Улады прызналі некалькі СМІ экстрэмісцкімі фармаваннямі. 1 лістапада па рашэнні КДБ інфармацыйнае агенцтва БелаПАН унесена ў Пералік арганізацый, фарміраванняў, індывідуальных прадпрымальнікаў, якія маюць дачыненне да экстрэмісцкай дзейнасці. 3 лістапада МУС прызнала экстрэмісцкім фармаваннем групу грамадзян, аб’яднаных праз інтэрнэт-рэсурсы «Белсат». 23 снежня МУС прызнала экстрэмісцкім фармаваннем групу грамадзян, якія аб’ядналіся праз інтэрнэт-рэсурсы «Радыё Свабода».

Такія рашэнні ставяць журналістаў і супрацоўнікаў гэтых медыярэсурсаў пад пагрозу крымінальнага пераследу.

## VII. КАТАВАННІ І ЖОРСТКАЕ, БЕСЧАЛАВЕЧНАЕ, ПРЫНІЖАЛЬНАЕ АБЫХОДЖАННЕ

Уладамі Беларусі не праведзена належнага расследавання каля пяці тысяч зваротаў, у тым ліку больш за 100, якія паступілі ад непаўналетніх, аб расследаванні і прыцягненні да адказнасці вінаватых у катаваннях і іншых актах забароненага абыходжання ў дачыненні да ўдзельнікаў мірных акцый пратэсту і іншых асоб, якія паступілі ў следчыя органы, у тым ліку 680 заяў аб катаваннях у ізалятарах г. Мінска непасрэдна пасля выбараў у жніўні 2020 года, калі тысячы затрыманых удзельнікаў пратэстаў у Мінску і іншых гарадах краіны былі мэтанакіравана падвергнутыя катаванням і іншым відам жорсткага, бесчалавечнага і зневажальнага абыходжання.

На дадзены момант ПЦ «Вясна» задакументавана больш за 1 000 сведчанняў ахвяр катаванняў. За 2021 год «Вясной» праведзеныя 320 інтэрв’ю; сярод ахвяр забароненага абыходжання 24% жанчын, 76% мужчын. 102 чалавекі сталі ахвярамі такога звароту ў 2021 годзе. Аналіз атрыманых звестак дазваляе сцвярджаць, што катаванні і забароненае абыходжанне па-ранейшаму носяць масавы, сістэмны характар і з'яўляюцца арганізаванай, палітычна матываванай карнай акцыяй уладаў па застрашэнні беларускага грамадства.

Заявы ахвяраў катаванняў і забароненага абыходжання ў 2021 годзе ўладамі разглядаліся павярхоўна, без узбуджэння крымінальных спраў і правядзення належных следчых дзеянняў. Характэрнай рысай вынесеных пастаноў аб адмове ў завядзенні крымінальнай справы ў розных рэгіёнах краіны з’яўляецца адсутнасць звестак аб магчымых падазраваных супрацоўніках ОУС, адсутнасць іх апытанняў у сувязі з рэалізацыяй “мерапрыемстваў па абароне гонару, годнасці і дзелавой рэпутацыі, забеспячэння бяспекі супрацоўнікаў ОУС”. Таксама не праводзіцца дастатковых дзеянняў па фіксацыі слядоў злачынстваў і пошуку доказаў злачынстваў у адносінах да грамадзян. Ахвярам адмаўляюць у выдачы копіяў адпаведных пастаноў альбо адвольна зацягваюць іх выдачу.

Улады па-ранейшаму ствараюць у месцах пазбаўлення волі, СІЗА і ізалятарах асабліва жорсткія ўмовы ўтрымання для палітвязняў, арыштаваных і затрыманых па палітычных матывах. Іх адвольна ставілі на прафілактычны ўлік, змяшчалі ў штрафныя ізалятары, падвяргалі правакацыям, абмяжоўвалі ў ежы, прагулках і ўтрымлівалі ў антысанітарных умовах. Зняволеныя ў мінскіх ізалятарах ГУУС падвяргаюцца катаванням у сувязі са шматразовым перанасяленнем ізалятараў, адсутнасцю пасцельных прыналежнасцей, у тым ліку матрацаў і падушак, зубных шчотак і іншых прадметаў першай неабходнасці, дастатковай колькасці вады, прагулак і іншых устаноўленых законам гарантый для адміністрацыйна затрыманых і арыштаваных. Часта да іх змяшчаюць у камеры бяздомных людзей, якія не прайшлі санітарную апрацоўку, заражаючы паразітамі, не рэагуюць на сімптомы каранавіруснай інфекцыі. Іх зняволенне па сваім характары мяжуе з катаваннем па палітычных матывах.

У прыватнасці, 1 лістапада стала вядома, што ў жодзінскай турме №8 з моманту пераводу дзясяткаў затрыманых за каментары па «справе Зельцэра» аб’явілі каранцін, у сувязі з якім вязняў абмежавалі ва ўсім: палітвязням не перадавалі перадачы, да некаторых не пускалі адвакатаў. Зняволеныя больш за месяц знаходзіліся без сродкаў гігіены і цёплых рэчаў. 4 лістапада праваабаронцы «Вясны» ў інтарэсах затрыманых па «справе Зельцэра» звярнуліся да спецдакладчыкаў ААН: па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі Анаіс Марэн, па пытанні аб катаваннях і іншых формах бесчалавечнага і зневажальнага абыходжання Нільса Мельцэра, па пытанні аб заахвочванні і абароне права на свабоду меркаванняў і іх свабоднае выказванне Ірэн Хан, а таксама ў працоўную групу ААН па адвольных затрыманнях па пытанні жорсткага і бесчалавечнага абыходжання з імі пасля затрымання і падчас утрымання ў турме. 15 лістапада стала вядома, што каранцін у жодзінскай турме зняты.

Беспакаранасць злачынстваў правакуе новыя выпадкі забароненага абыходжання і катаванняў.

У сакавіку Вадзім Дзмітранок у судзе Цэнтральнага раёна г. Мінска заявіў аб прымяненні да яго катаванняў супрацоўнікамі ОУС: тыя нанеслі яму ўдары ў розныя часткі цела і распылілі пярцовы газ з блізкай адлегласці. Пасля прыбыцця абаронцы ніякіх следчых дзеянняў з ім не адбывалася ў сувязі са станам здароўя — мужчыну павезлі ў лякарню. На відэазапісе, распаўсюджаным ОУС, зафіксаваны сляды пабояў на твары і агульны стан затрыманага.

У судзе Савецкага раёна Мінска Кірыл Паўлавец заявіў аб тым, што “ў РАУС мяне не адразу затрымалі, выклікалі, забралі тэлефон, спыталі пароль, адвялі ў іншы кабінет і пачалі збіваць. Потым прымусілі падпісаць паказанні”.

Яўген Бароўскі, Іван Зянько, Аляксей Дроба ў судзе Фрунзенскага раёна заявілі аб катаваннях пасля затрымання: супрацоўнікі ОУС збівалі іх, пагражалі згвалтаваннем.

1 чэрвеня палітвязень Сцяпан Латыпаў паспрабаваў здзейсніць суіцыд у зале суда і заявіў аб катаваннях.

У ліпені аб катаваннях з мэтай атрымаць прызнальныя паказанні заявіў анархіст Мікалай Дзядок, затрыманы супрацоўнікамі ГУБАЗіК МУС; ягоны стан пасля затрымання быў зафіксаваны на відэа. Ніякіх мер да асоб, якія ўжывалі гвалт і катаванні, не прынята, паўнавартаснага расследавання заявы Дзядка не праведзена.

Гэтыя і іншыя факты катаванняў дэманстратыўна не расследуюцца ўладамі. У прыватнасці, нягледзячы на намаганні абвінавачанай і абаронцы, не было своечасова праведзена медыцынскае абследаванне Вольгі Залатар пасля таго, як яна падвергнулася катаванням, і не распачата адпаведная крымінальная справа па факце катаванняў, нягледзячы на наяўнасць іншых, акрамя заключэння эксперта, доказаў.

## VIII. ПАРУШЭННІ СВАБОДЫ АБ'ЯДНАННЯЎ

10 красавіка міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей выказаўся аб тым, што любое далейшае ўзмацненне жорсткасці санкцый у дачыненні да Беларусі прывядзе да таго, што грамадзянская супольнасць у краіне перастане існаваць. Гэтае выказванне чыноўніка было справядліва ўспрынята як прамая пагроза пераследам і ціскам на недзяржаўныя арганізацыі.

14 ліпеня супрацоўнікі МУС і ДФР правяліператрусы ў офісах некалькіх партый і грамадскіх аб'яднанняў, праваабаронцаў і палітыкаў. У прыватнасці — у Беларускім Хельсінкскім камітэце, Руху «За Свабоду», ПЦ «Вясна», Human Constanta. Усяго ў ліпені стала вядома пра больш за 40 НДА, якія падверглісяператрусам.

22 ліпеня апавяшчэнне аб пададзеным Міністэрствам юстыцыі пазове аб ліквідацыі атрымаў Беларускі ПЭН-цэнтр, а 9 жніўня Вярхоўны Суд Беларусі вынес рашэнне аб яго ліквідацыі. 23 ліпеня стала вядома аб дзясятках рашэнняў аб ліквідацыі НДА, зарэгістраваных Мінгарвыканкамам. Сярод іх дабрачынны праект «Імёны», «Прэс-клуб Беларусь», праваабарончыя арганізацыі Human Constanta, Lawtrend, «Офіс па правах людзей з інваліднасцю», а таксама Беларускі нацыянальны маладзёжны савет «Рада», Цэнтр еўрапейскіх даследаванняў, «Офіс еўрапейскай экспертызы і камунікацыі».

27 жніўня Вярхоўным Судом ліквідаваная Беларуская асацыяцыя журналістаў. 1 кастрычніка стала вядома аб рашэнні Вярхоўнага Суда, якім ліквідаваны Беларускі Хельсінкскі Камітэт, а 5 кастрычніка была ліквідаваная іншая вядомая беларуская праваабарончая арганізацыя —«Прававая ініцыятыва».

8 кастрычніка Вярхоўны Суд ліквідаваў грамадскі рух «Гавары праўду», 19 лістапада ліквідаваны Рух «За Свабоду».

Да цяперашняга часу ліквідаваны або знаходзяцца ў працэсе ліквідацыі не менш за 304 НДА, а 194 НДА прынялі рашэнне аб самаліквідацыі — часта пад ціскам рэгіструючага органа.

На гэтым фоне напрыканцы года ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ў двух чытаннях прыняты законапраект аб вяртанні ў Крымінальны кодэкс артыкула 193-1, які прадугледжвае адказнасць за ўдзел у дзейнасці незарэгістраванай або пазбаўленай рэгістрацыі партыі ці грамадскага аб'яднання, адмененага раней пад ціскам грамадскасці і міжнародных арганізацый.

Летась улады жорстка спынялі дзейнасць рознага кшталту нефармальных грамадскіх ініцыятываў. У прыватнасці, Вольга Залатар была затрымана ў сакавіку за актыўнасць, звязаную са стварэннем і дзейнасцю раённага чата «Ждановічы 2020 — клуб аматараў Цоя». Чат быў прызнаны экстрэмісцкім фарміраваннем у кастрычніку 2021, а Залатар 30 лістапада асуджаная да пазбаўлення волі тэрмінам на чатыры гады за стварэнне

экстрэмісцкага фарміравання і арганізацыю і падрыхтоўку дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак.

Усяго за час з 18 кастрычніка, калі на сайце МУС быў апублікаваны пералік экстрэмісцкіх фарміраванняў, у яго было ўнесена больш за 30 груп грамадзян, аб'яднаных удзелам у розных тэлеграм-групах, групах у сацыяльных сетках і дзейнасцю на сайтах. Такім чынам, удзел у дзейнасці гэтых груп стаў пагражаць пазбаўленнем волі. Рашэнні аб прызнанні пералічаных у пераліку груп экстрэмісцкімі фарміраваннямі прыняты выключна па палітычных матывах у парушэнне свабоды асацыяцый.

## IX. ЗАХАВАННЕ СТАНДАРТАЎ СПРАВЯДЛІВАГА СУДА. ЦІСК НА АДВАКАТАЎ

Становішча з выкананнем стандартаў справядлівага суда напрамую прадэманстравала глыбокую трансфармацыю судовай сістэмы ў інструмент рэпрэсій. Праваабаронцы, юрысты і эксперты канстатуюць глабальны крызіс, які зазнала з другой паловы 2020 года сістэма правасуддзя ў Беларусі. У 2021 годзе суддзі па-ранейшаму безумоўна і ініцыятыўна выконвалі сваю ролю ў канвееры беззаконня; судаводства па палітычна матываваных справах канчаткова страціла характар правасуддзя.

Суддзі не рэагуюць на заявы аб прымяненні катаванняў, не прыпыняюць разгляд справы да расследавання паведамленняў аб катаваннях, абгрунтоўваюць прысуды доказамі, атрыманымі з прымяненнем катаванняў.

Усе найбольш аб'ёмныя і значныя палітычна матываваныя справы, за выключэннем крымінальнай справы Віктара Бабарыкі і іншых супрацоўнікаў «Белгазпрамбанка», прайшлі ў закрытым фармаце. Закрытыя судовыя пасяджэнні пазбавілі бок абароны магчымасці адкрыта выказацца ў публічнай прасторы аб абставінах справы, довадах у абарону абвінавачаных, ацэнках доказаў абвінавачання. Так, у закрытым судовым пасяджэнні разгледжаны крымінальныя справы М. Знака і М. Калеснікавай, С. Ціханоўскага, М. Статкевіча і інш., Л. Судаленкі і Т. Ласіцы, І. Аліневіча і інш., шэрагу іншых палітвязняў.

Дзяржаўныя прапагандысцкія рэсурсы рэгулярна публікуюць звесткі, якія парушаюць прэзумпцыю невінаватасці. Таксама рэгулярна публікуюцца ролікі з запісанымі прызнаннямі і раскаяннем у зробленым фігурантаў пратэснай актыўнасці. Гэтыя ролікі з'яўляюцца пераканаўчым доказам парушэння працэсуальных правоў затрыманых, а таксама часта ўтрымліваюць доказы прымянення да іх катаванняў і іншых забароненых відаў абыходжання.

Па-ранейшаму парушаецца права на бесперашкодны доступ да адвакатаў. Часта гэта адбываецца пад выглядам абмежавальных мер у сувязі з эпідэміялагічнай абстаноўкай. Аднак аналіз сітуацыі ў цэлым дае падставу рабіць выснову аб адвольных абмежаваннях працэсуальных правоў затрыманых і арыштаваных.

Праваабарончы цэнтр «Вясна» з дапамогай валанцёраў праводзіў маніторынгі судовых працэсаў па палітычна матываваных крымінальных справах, збіраў інфармацыю аб дадзенай катэгорыі спраў дзеля іх аналізу з пункту гледжання захавання міжнародных стандартаў правоў чалавека і інфармавання беларускай грамадскасці і міжнароднай супольнасці аб стане правоў чалавека ў краіне. У красавіку па выніках маніторынгу больш за 150 судовых пасяджэнняў па крымінальных справах была падрыхтаваная справаздача

«Крымінальны пераслед па палітычных матывах. Беларусь 2020-2021 гг.», а па выніках аналізу і ацэнкі даных ад 44 наглядальнікаў аб 590 судовых пасяджэннях па адміністрацыйных справах у 17 судах Беларусі, а таксама звестак, атрыманых ад больш як 600 затрыманых па адміністрацыйных справах з 38 гарадоў Беларусі, якія яны падалі ПЦ «Вясна» — справаздача «Палітычна матываваныя адміністрацыйныя працэсы: стандарты і рэальнасць у сучаснай Беларусі».

Адвакаты пазбаўлены магчымасці выконваць свае абавязкі ў абстаноўцы свабоды і адсутнасці якога-небудзь ціску. На працягу года больш за 30 адвакатаў былі асуджаныя або адвольна выгнаныя з прафесіі.

6 верасня адвакат Максім Знак асуджаны да 11 гадоў пазбаўлення волі за дзейнасць у складзе прэзідыума Каардынацыйнай рады — органа, створанага апазіцыяй з мэтай арганізацыі працэсу пераадолення палітычнага крызісу і забеспячэння згоды ў грамадстве, а таксама дзеля абароны суверэнітэту і незалежнасці. Працягваецца крымінальны пераслед адваката Іллі Салея, які быў вымушаны пакінуць краіну. Разам з іншымі адвакатамі М. Знак і І. Салей абаранялі і прадстаўлялі інтарэсы В. Бабарыкі — аднаго з асноўных прэтэндэнтаў на пасаду прэзідэнта на выбарах 2020 года.

У розны час на працягу года былі пазбаўлены магчымасці працягваць дзейнасць адвакаты Людміла Казак, Канстанцін Міхель, Максім Конан, Міхаіл Кірылюк, Сяргей Зікрацкі, Уладзімір Сазанчук, Вольга Баранчык, Барыс Ляскоўскі, Уладзіслаў Філіповіч, Сяргей Пічуха, Андрэй Барташэвіч, Алена Шынкарэвіч, Мікалай Ётка, Ганна Ваўчынская, Святлана Халаловіч, Міхаіл Баднарчук, Андрэй Мачалаў, Дзмітрый Лаеўскі, Антон Гашынскі, Кацярына Жалтонога, Вольга Карпушонак, Яўген Маслаў, Юлія Князь, Андрэй Цялегін, Наталля Мацкевіч, Яўген Пыльчанка, Ірына Варанкова, Ігар Петрашэвіч, Аляксей Кераль, Дзмітрый Лазавік, Наталля Аляксеева, Наталля Ванцовіч, Лізавета Матвеева і шэраг іншых адвакатаў. Рэальнымі падставамі для пазбаўлення статусу адваката сталі іх грамадскія і палітычныя погляды і дзейнасць, рэалізацыя правоў і свабод, удзел у якасці абаронцаў па палітычна матываваных справах. Органы адвакацкага самакіравання ўключыліся ў кампанію пераследу адвакатаў разам з органамі ўлады.

У выніку спешна прынятых зменаў заканадаўства аб адвакатуры адвакаты пазбаўлены магчымасці ажыццяўляць сваю дзейнасць у іншых, акрамя юрыдычных кансультацый, формах, а таксама права самастойна выбіраць органы самакіравання. Залежнасць адвакатуры ад органаў выканаўчай улады па розных аспектах дзейнасці яшчэ больш узмацнілася, татальны кантроль над органамі адвакацкага самакіравання выйшаў на іншы якасны ўзровень, пазбавіўшы адвакатуру рэштkaў незалежнасці і самакіравальнасці.